

СУПРАЦЬ БУЛІНГУ Ў ШКОЛЕ

Сямейная газета



САКРЭТ ШЧАСЦЯ ГЛУХАЎ

Сямейная газета

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

18 САКАВІКА 2021 г. ЧАЦВЕР № 50 (29419)

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Наталля КАЧАНАВА, старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь:**

*«Ахвотных патрапіць на прыём у Савет Рэспублікі вельмі шмат. Да мяне запісалася больш за сто чалавек. Фізічна прыняць такую колькасць людзей немагчыма, хоць я і запланавала весці яго на працягу ўсяго дня, разумеючы колькасць ахвотных. Хачу нагадаць, што ёсць шмат розных спосабаў да нас звярнуцца: грамадзян прымаюць мае калегі — старшыні камісій, ёсць электронныя, пісьмовыя звароты, прамыя тэлефонныя лініі. Мы ўсе звароты трымаем на кантролі і па ўсіх абавязкова дасканала разбіраемся. І стараемся давесці да лагічнага завяршэння».*

**(Больш падрабязна аб тым, як прайшоў прыём грамадзян, чытайце ў заўтрашнім нумары «МС»).**

# Суперкран для вялікага горада

### Гэта машына з істотнай грузападымальнасцю прашмыгне ў любую гарадскую кропку і дастане да 11-га паверха




Фота Яна ХВЕДЧЫНА.

**Мінскі аўтамабільны завод стварыў першы аўтакран з «тэлескапічнай» стралой (авоіднага профілю), які здольны хутка падымаць грузы на вышыню да 33 метраў. Навінка прадстаўлена на будаўнічай выстаўцы BUDEXPO-2021, якая праходзіць да 20 сакавіка ў Мінску.**

Па мініяцюрных габарытах — гэта гарадская машына, здольная развярнуцца на «пятачку». Аўтакран базіруецца на поўнапрыводным шасі 6х6 і можа свабодна перамяшчацца па дарогах з нясучай здольнасцю 10 тон. У рух яго прыводзіць 330-сільны рухавік класа Еўра-5, а 9-ступеньчатая каробка перадач уключае ў сябе помпу пад аварыйныя рулявы контур.

**Галоўны канструктар ААТ «МАЗ», завода «Магілёўтрансмаш» Павел КАРАНКЕВІЧ** адзначыў, што новая машына па сутнасці ўяўляе сабой кран-усюдыход, таму што яго можна выкарыстоўваць як у лёгкіх умовах, напрыклад на будаўнічых пляцоўках, так і ў цяжкіх — у кар'ерах, дзе складана перамяшчацца.

Аўтакран цяпер прайшоў увесь цыкл выпрабаванняў і атрымаў «дабро» разнастайных сертыфікацыйных дакументаў. А яго серыйная вытворчасць пачнецца з другога квартала гэтага года. Асноўная асаблівасць аўтакрана — магутная страла, здольная высоўвацца на 32,6 метра. На пачатковыя 10 метраў яна можа дастаўляць аб'ёмныя грузы вагой да 32 тон, а пры 11-метровым «вылеце» стралы — падняць больш за 4 тоны на вышыню да 33 метраў, што ўдвая больш, чым на аналагічных машынах, якія выпрабляюцца ў краінах СНД.

Дарэчы, як расказаў **начальнік упраўлення продажаў спецтэхнікі і шасі ААТ «МАЗ» Юрый ПІВАВАРАЎ,** першая ўнікальная машына ўжо практычна прададзена. Яна будзе працаваць на будоўлях Магілёва.

**Сяргей КУРКАЧ.**

## КОРАТКА

- **Прэзідэнты ЕАЭС сустрэнуцца ў маі ў Нур-Султане, прэм'ер-міністры — у красавіку ў Казані.**
- ВУП Беларусі ў студзені—лютым вырас на 0,8 %.
- **Раман Галоўчанка: будаўніцтва будынка Нацыянальнага дзіцячага тэхнапарка плануецца завяршыць да восені 2022 года.**
- Беларусбанк канстатуе запатрабаванасць іпатэчнага крэдытавання.
- **Мінэнерга: у пагадненне з Расіяй па пастаўках газу плануецца ўнесці тэхнічныя змяненні.**
- У Брэсце выбіраюць праекціроўшчыка будынка загса.

Незабыўнае

# МЫ ЖЫВЁМ, ПАКУЛЬ ПОМНІМ

**Гэтыя словы, напісаныя на мемарыяле на месцы спаленай фашыстамі вёскі Ала ў Светлагорскім раёне, у Беларусі зразумелыя, як нідзе ў свеце. Наша памяць пра вайну праз некалькі пакаленняў ужо выходзіць на генетычны ўзровень, яе захаванне становіцца адной з важных умоў нашага існавання як нацыі. І гэта не гучныя словы. Асабліва сёння, калі гісторыю мінулай (і дай бог, апошняй на гэтай зямлі) вайны спрабуюць перапісаць.**

Толькі не тут, толькі не ў Беларусі. Бо тут паўсюль стаяць помнікі спаленым вёскам і забітым людзям. І дату 23 сакавіка 1943 года — дзень, калі перастала існаваць на зямлі вёска Хатынь, мы памятаем. І дзяцей, і ўнукаў сваіх мы выхоўваем так, каб памяталі і яны, і іх дзеці і ўнукі.

На гэтым тыдні па ўсёй Беларусі праходзіць акцыя па добраўпарадкаванні мемарыялаў ахвярам вайны. Да яе падключыліся ўсе рэгіёны, і гэта не проста наводзенне парадку пасля зімы. Разам са званамі Хатыні ў сэрцы кожнага нармальнага чалавека, які жыве на нашай зямлі, адгукаюцца галасы соцень знішчаных нелюдзямі жыхароў такіх паселішчаў. Пакуль мы чуем гэтыя галасы, пакуль ведаем пра іх, мы маем права звацца жывымі.

***Аб тым, як праходзіць акцыя ў рэгіёнах, — на 4-й стар.***

ISSN 1990 — 763X

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

**Падпішыся на «Звязду» – і выйграй карысны прыз!**

**Ідзе падпіска на II квартал 2021 года**

**ВЯСНА І ЛЕТА — З ЛЮБІМАЙ ГАЗЕТАЙ!**